ческом строе современного русского языка. Л., 1982; Чеснокова Л. Д. Учение о членах предложения в аспекте статических и динамических моделей языка // Предложение как многоаспектная единица языка. М., 1984. С. 93.

[12] Маковский М. М. Системность и асистемность в языке. Опыт исследования отношений в лексике и семантике. М., 1980. С. 8.

[13] Гл.: Дымарская-Бабалян И. Н. О функционировании номинативных предложений в структуре ССЦ // Вопросы русского языка и литературы. Ереван, 1984. Вып. 1.

Г. М. МЕЗЕНКА

# НАМІНАЦЫЯ ЎНУТРЫГАРАДСКОГА АБ'ЕКТА Ў АДНОСІНАХ ДА ІНШЫХ АБ'ЕКТАЎ

На ўсіх этапах развіцця беларускай урбананіміі вядучым аказваўся прынцып намінацыі аб'екта ў адносінах да іншых аб'ектаў, што адпавядае асноўнай функцыі урбанонімаў — быць адрасам. Колькасць урбанонімаў, утвораных у адпаведнасці з гэтым прынцыпам намінацыі, пераважае над усімі астатнімі. У XVI ст. у розных беларускіх гарадах (вывучаны урбананіміконы дваццаці двух населеных пунктаў) на долю гадонімаў, якія адпавядаюць названаму прынцыпу намінацыі, прыходзілася ў сярэднім каля 75 % агульнай колькасці назваў унутрыгарадскіх лінейных аб'ектаў. У XVII — першай палове XIX ст. іх працэнтнае ўтрыманне некалькі ўзрасло, дасягнуўшы амаль 77 %. На працягу другой паловы XIX ст. колькасць іх прыкметна паменшылася (63 %), склаўшы ў пачатку XX ст. толькі 53,6 %. У канцы XX ст. зноў намецілася тэндэнцыя да павелічэння іх колькасці: цяпер у буйнейшых гарадах рэспублікі — Мінску, Гомелі, Віцебску, Магілёве, Гродне, Брэсце, Оршы, Полацку — назвы гэтай разнавіднасці складаюць 54,7 % агульнай колькасці гадонімаў даследаваных гарадоў.

Указаны прынцып намінацыі ўнутрыгарадскіх тапаграфічных аб'ектаў ажыццяўляецца ў асноўным праз дзве прыметы: прымету, якая характарызуе месцазнаходжанне вуліцы, завулка, плошчы і г. д. адносна іншых аб'ектаў, і прымету, якая падкрэслівае сувязь аднаго аб'екта (вуліцы, плошчы і да т. п.) з іншым (населеным пунктам).

Першая з прымет з'яўляецца агульнай для некалькіх лексіка-семантычных груп урбанонімаў. Ёй валодаюць назвы, матываваныя найменнямі архітэктурных аб'ектаў:

а) культавых збудаванняў: *Петропавловская ул.* (Гомель, 1914 г.), *Глебо-Борисовская ул.* (Магілёў, 1918 г.), *Монастырская ул.* (Кобрын, 1939 г.);

б) вучэбных, лячэбных, спартыўных і відовішчных устаноў: *Школьны завул.* (Брэст), *Шпітальная вул.* (Гомель), *Клубны завул.* (Віцебск);

в) прамысловых прадпрыемстваў — заводаў, фабрык: *Велазаводская вул.* (Мінск), *Цагляная вул.* (Гродна), *Пракатная вул.* (Магілёў);

г) гандлёвых кропак: *Базарная пл.* (Кобрын, 1939 г.), *Магазинная ул.* (Мінск, 1926);

д) розных служб горада: *Пажарны завул., Паштовы завул.* (Орша), *Вакзальная вул.* (Полацк), *Аэрадромная вул.* (Брэст, Мінск).

Да гэтай групы далучаецца невялікая колькасць урбанонімаў, матываваных назвамі элементаў (атрыбутаў) абсталявання чыгуначнай станцыі, тыпу *Семафорны завул., Пражэктарная вул., Рэзервная вул., Рэйкавы завул., Паравозная вул.* (Магілёў). Даная група — адзін з новых напрамкаў пашырэння аб'ёму урбананімнай лексікі, які з'явіўся ў другой палове XX ст.

Прымета, якая характарызуе месцазнаходжанне вуліцы, плошчы і да т. п., з'яўляецца асноўнай і ў назвах, якія апісваюць месцазнаходжанне ўнутрыгарадскога аб'екта адносна прыродных аб'ектаў: *Берагавая вул., Прыдарожная, Набярэжная вул.* (Брэст, Мінск), *Леванабярэжная вул.* (Гродна), *Зарэчная вул.* (Магілёў), *Прыбярэжная вул* (Віцебск).

З пэўнай доляй умоўнасці гэту прымету можна ўбачыць і ў невялікай групе найменняў, матываваных назвамі частак гарызонта: *Усходняя вул.* (Брэст, Віцебск, Мінск, Гомель, Гродна і інш.), *Заходні тупік* (Брэст), *Паўночная вул., Паўднёва-Заходняя вул.* (Мінск).

Гэта ж прымета з'яўляецца асноватворнай і ў групе найменняў, якія паўтараюць назвы іншых унутрыгарадскіх лінейных аб'ектаў. Гэта група неаднародная і ўключае розныя адзінкі. У першую чаргу ў яе ўваходзяць назвы завулкаў, праездаў, тупікоў, плошчаў, шашы, праспектаў, якія размешчаны побач з аднайменнай вуліцай і паўтараюць яе назву.

Так, у Мінску ў залежнасці ад таго, назва якога аб'екта паўтарае найменне вуліцы, выдзяляецца 12 разнавіднасцей урбананімічнай метанімії:

1) назва вуліцы → назва завулка. Гэты тып найбольш распаўсюджаны: сустракаецца 108 пар аднайменных назваў вуліц і завулкаў: *Авангардная вул.— Авангардны завул., Шпалерная вул.— Шпалерны завул., вул. Талаша — завул. Талаша* і да т. п.;

2) назва вуліцы → назва праезда. Пераносаў назваў гэтага тыпу значна менш — 13: *Волжская вул.— Волжскі праезд, вул. Галадзеда — завул. Галадзеда, Клецкая вул.— Клецкі праезд* і інш.;

3) назва вуліцы → назва плошчы: *вуліца Леніна — пл. Леніна;*

4) назва вуліцы → назва праспекта: *Партызанская вул.— Партызанскі праспект.*

Радзей назва вуліцы пераносіцца не на адзін, а адразу на два або тры аб'екты:

5) назва вуліцы → назва завулка → назва праезда: *Дняпроўская вул.— Дняпроўскі завул.— Дняпроўскі праезд; Прыгожая вул.— Прыгожы завул.— Прыгожы праезд; Наватарская вул.— Наватарскі завул.— Наватарскі праезд; Новавіленская вул.— Новавіленскі завул.— Новавіленскі праезд; вул. Талстога — завул. Талстога — праезд Талстога; вул. Чайкоўскага — завул. Чайкоўскага — праезд Чайкоўскага* і да т. п.;

6) назва вуліцы → назва завулка → назва тупіка: *Заслаўская вул.— Заслаўскі завул.— Заслаўскі тупік; Слонімская вул.— Слонімскі завул.— Слонімскі тупік;*

7) назва вуліцы → назва завулка → назва плошчы: *вул. Я Коласа — завул. Я. Коласа — пл. Я. Коласа; вул. Калініна — завул. Калініна — пл. Калініна;*

8) назва вуліцы → назва завулка → назва тупіка → назва шашы: *Магілёўская вул.— Магілёўскі завул.— Магілёўскі тупік — Магілёўская шаша;*

9) назва вуліцы → назва завулка → назва праезда → назва тупіка: *Капыльская вул.— Капыльскі завул.— Капыльскі праезд — Капыльскі тупік.*

Адзінкавыя выпадкі урбананімічнай метанімії, пры якой пераносіцца назва не вуліцы, а іншых аб'ектаў:

10) назва тракта → назва вуліцы: *Старавіленскі тракт — Старавіленская вул.;*

11) назва тракта → назва завулка → назва праезда: *Смаргаўскі тракт — Смаргаўскі завул.— Смаргаўскі праезд;*

12) назва завулка → назва праезда: *Калектыўны завул.— Калектыўны праезд, Зарэчны завул.— Зарэчны праезд.*

Паказальна, што ў гарадах з колькасцю вуліц менш чатырохсот зарэгістраваны выпадкі толькі трох разнавіднасцей урбананімічнай метанімії: назва вуліцы → назва завулка, назва вуліцы → назва плошчы і назва завулка → назва тупіка са значнай перавагай першай. У малых жа гарадах ў сувязі з агульнай невялікай колькасцю вуліц, завулкаў, плошчаў найменні, якія паўтараюць назвы іншых аб'ектаў,— гэта, як правіла, найменні завулкаў.

Гэтай жа прыметай валодаюць і так званыя нумарныя назвы. Яны сустракаюцца сярод гадонімаў і харонімаў. Парадкавы нумар, з'яўляючыся асноўным адрознівальным элементам такіх назваў, у той жа час вызначае месцазнаходжанне данага аб'екта сярод іншых, якія паўтараюць назву вуліцы або завулка, што сталі *«кропкай адліку»* для нумарных назваў, параўн.: *Брэсцкая вул.* і *1-ы Брэсцкі завул., 2-і Брэсцкі завул., 3-і Брэсцкі завул., 4-ы Брэсцкі завул., 5-ы Брэсцкі завул.; Дамашэўская вул., Дамашэўскі завул., 1-ы Дамашэўскі завул., 2-і Дамашэўскі завул., 3-і Дамашэўскі завул., 4-ы Дамашэўскі завул., 5-ы Дамашэўскі завул. і інш.* (Мінск, 1988).

Найменні, якія паўтараюць назву суседняга ўнутрыгарадскога аб'екта, асабліва нумарныя, таксама ўяўляюць сабой адзін з новых напрамкаў пашырэння як структурнага, так і семантычнага патэнцыялу урбананімнай лексікі. Матывіроўка урбаноніма абумоўлена не толькі прыродай названага аб'екта, суб'ектыўным бачаннем стваральніка урбананімнай адзінкі, але і лексіка-семантычнымі рэсурсамі урбананімнай (і шырэй анімічнай) сістэмы. Пошукі новых магчымасцей і прывялі да з'яўлення такіх адзінак.

Узнікшы ў канцы XVIII ст., гэтыя атрыбутыўна-ад'ектыўныя канструкцыі першапачаткова, паўтараючы адным з сваіх элементаў назву вядомай вуліцы і ўжо тым самым вызначаючы месцазнаходжанне новай, другім элементам падкрэслівалі памер, знешні выгляд, прасторавае размяшчэнне, час з'яўлення і іншыя асаблівасці новага аб'екта, удакладнялі яго месцазнаходжанне ў адносінах да іншых значных аб'ектаў: *Поперечная Ильинская ул. (параўн.: Ильинская ул.), Долгая Ильинская, Эзуитская Задуновская ул.*[1], *Почтовая Петровская ул., Полковая Магазейная ул.* (Віцебск, 1783 г.), *Ulica Poboczna Niemiska* (параўн.: *Ulica Niemiska*), *Ulica Bromowa Łoszycka* (параўн.: *Ulica Łoszycka*) (Мінск, 1765 г.[2]), *Ulica Wielka Cerkiewna* (Нясвіж, 1733 г.).

Пэўная частка такіх назваў характарызуецца сумяшчэннем розных прынцыпаў намінацыі — па адносінах да іншых аб'ектаў і па ўласцівасцях і якасцях самога аб'екта. Прычым, дыферэнцыяльным у гэтых назвах становіцца прымета, якая абазначаецца залежным кампанентам (які не паўтарае, а ўдакладняе), і менавіта ў ім змешчана асноўная сіла намінацыі.

У XIX ст. колькасць найменняў, якія паўтараюць назву сумежнага з ім або несумежнага аб'екта, павялічылася нязначна. Так, калі ў XVIII ст. на іх долю прыходзілася ў сярэднім каля 4,5—5 % агульнай колькасці назваў унутрыгарадскіх лінейных аб'ектаў, то ў XIX ст.— 6,9—7 %. XX ж стагоддзе характарызуецца «выбухам» у выкарыстанні адзінак гэтага тыпу: у XX ст., асабліва другой яго палове, іх працэнтнае ўтрыманне ў сярэднім склала 33 (у асобных гарадах, напрыклад, у Віцебску, нават каля палавіны назваў).

Тлумачэнне гэтай з'явы ляжыць у экстралінгвістычнай сферы. Аднаўленне і хуткі рост беларускіх гарадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны патрабавалі інтэнсіфікацыі намінатыўнага працэсу. У 1960-я гг. пачаў прымяняцца новы метад забудовы — вялікія жыллёвыя масівы. Асноўнай планіровачнай адзінкай становіцца мікрараён, у межах якога выдзяляецца магістральная вуліца, назва якой робіцца «зыходнай кропкай» для наймення астатніх лінейных аб'ектаў: яна паўтараецца ў назве кожнага з іх з пэўнай канкрэтызацыяй. Так, напрыклад, сучасны мікрараён Поўдзень-3 у Віцебску ў 1950-х гг. складаўся з васьмі вуліц: *Сокольницкая ул., Сокольницкий пер., 1-я Сокольницкая ул., 2-я Сокольницкая ул., 3-я Сокольницкая ул., 4-я Сокольницкая ул., 5-я Сокольницкая ул., 6-я Сокольницкая ул.,*— якія ўтваралі своеасаблівы ансамбль, што дапамагаў арыентавацца ў горадзе і хутка знаходзіць вуліцу ў межах мікрараёна. Лёгка было адшукаць і мікрараёны *Продольных улиц* (іх было пяць), і вуліц Чкалава (іх было чатырнаццаць) і да т. п.

Другая прычына рэзкага павелічэння нумарных назваў заключаецца ў тым, што на планах гэтыя будучыя лінейныя аб'екты нумараваліся, а

гэта садзейнічала ў далейшым уключэнню нумара ў назву наймення новай вуліцы або завулка.

Аднак высокая ступень застандартызаванасці такіх назваў, нізкая інфарматыўнасць і непажаданыя канатацыі зніжанага плану ў генітыўна-нумаратыўнай іх разнавіднасці (параўн.: *1-ы завул. Кажадуба, 2-і завул. Кажадуба* і да т. п.) прыпынілі з'яўленне новых адзінак данай групы. У апошнія гады часта адзначаюцца факты замены гэтых назваў найменнямі «чыстага» генітыўнага тыпу. Так, у Віцебску ў 1987 г. быў ліквідаваны ансамбль назваў, які ўключаў дзесяць вуліц Валадарскага *(1-я — 10-я вул. Валадарскага)*. На жаль, пры перайменаванні гэтых лінейных аб'ектаў метад ансамбля не вытрыманы: сярод дзесяці вуліц знаходзім і вуліцы, названыя ў гонар рускага пісьменніка І. І. Лажэчнікава, гісторыка і краязнаўца А. П. Сапунова, акцёра П. С. Малчанава, і ў гонар удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны Я. В. Смушкевіча, З. Партновай, удзельнікаў устанаўлення Савецкай улады на Віцебшчыне В. Я. Каралёва, Ю. Гайдука, і ў гонар авіяканструктара П. В. Сухога.

Другая прымета, праз якую ажыццяўляецца прынцып намінацыі па адносінах да іншага аб'екта, указвае на сувязь лінейнага ўнутрыгарадскога аб'екта з іншым геаграфічным аб'ектам. Даная прымета аб'ядноўвае вялікую колькасць урбанонімаў, матываваных тапонімамі, мікратапонімамі, гідронімамі, аронімамі і да т. п.

У пачатковы перыяд развіцця беларускай урбананіміі гэта прымета фарміравала самую шматлікую групу назваў па найменню населеных пунктаў, у напрамку якіх вялі вуліцы. На долю гэтай групы гадонімаў у XVI ст. прыходзілася 42,3 % агульнай колькасці ўнутрыгарадскіх лінейных аб'ектаў. У XVII ст. іх лік павялічыўся яшчэ амаль на 7 %, але, пачынаючы з XVIII ст., паступова пайшоў на спад, некалькі ажывіўшыся ў пачатку XIX ст. Параўн.: XVIII ст.— 36,2 %, пачатак XIX ст.— 37, канец XIX ст.— 23, пачатак XX ст.— 18,8, канец XX ст.— 9,5 %.

Пры гэтым трэба падкрэсліць, што калі да канца XIX стагоддзя ў гэтую групу ўваходзілі амаль выключна назвы вуліц, матываваныя найменнямі населеных пунктаў, у напрамку якіх яны вялі, то ў XX ст. у іх лік пачалі ўваходзіць і назвы, якія прысвойваюцца нібы «у гонар гарадоў» і з'яўляюцца своеасаблівымі сімваламі дружбы і добрасуседскіх адносін, прычым не толькі гарадоў Беларусі і іншых рэспублік СССР, але і гарадоў-пабрацімаў іншых краін і народаў, параўн. *Зялёнагурская вул.* у Віцебску (па назве польскага горада-пабраціма Зялёнай Гуры), *вул. Клярмон-Фярана ў Гомелі* (па назве французскага горада-пабраціма) і да т. п.

Памяншэнне долі гадонімаў гэтай разнавіднасці знаходзіць як інтралінгвістычнае, так і экстралінгвістычнае тлумачэнне. Пачынаючы з XIX ст. актывізуюцца прынцыпы намінацыі ўнутрыгарадскіх аб'ектаў па сувязі іх з чалавекам як сацыясуб'ектам і па сувязі з абстрактным паняццем. У выніку ўжо ў пачатку XX ст. прымета, якая ўказвае на сувязь лінейнага аб'екта з іншым геаграфічным аб'ектам, уступае першынства прымеце, якая характарызуе ўнутрыгарадскі аб'ект з боку яго сувязі з імем чалавека, а ў канцы XX ст.— найменням, якія паўтараюць назвы суседніх лінейных аб'ектаў. Прадуктыўнасць ва урбананіміі пералічаных семантычных тыпаў назваў тлумачыцца таксама зменамі ў развіцці эканомікі, палітыкі, культуры.

[1] Назвы прыводзяцца ў арфаграфіі арыгінала. Гл.: Цэнтральны дзяржаўны архіў старажытных актаў. Ф. 1356, воп. 1, адз. зах. 123. План губернского города Витебска.
[2] Гл.: Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Літвы. Ф. ДА, адз. зах. 3789. Инвентарь староств и державь Минского воеводства.